Згода
ПАЛІТЫКА
N 24 (161) ● 9 ВЕРАСНЯ 2000Г.

ПОЛИТОБОЗРЕНИЕ

ОСЕННИЕ МОТИВЫ

Александр Сдвижков

Осень настала, пожухла трава.
Мальчик на улице колет дрова.
С хрустом железо в тело вошло.
Вместе с ногами детство ушло.

Сезонное оживление политической активности несказанно радует белорусских обозревателей чередой событий, достойных комментаторского пера.

Президент Лукашенко отыскал на Кубе братьев по разуму. Гораздо меньше таковых оказалось в Нью-Йорке, на генассамблее ООН. Ни тебе Саддама, ни Слободана. Только Сергей Наумчик в пикете.

Думец Зюганов увидал на Беларуси живое воплощение своих предвыборных обещаний российскому электорату. Еще раз 40 миллионов россиян, дважды голосовавших против лидера КПРФ, в 1996 и 2000 году, благословили Бога, что им хватило мудрости избегнуть печальной участи белорусов.

Круто обострилась белорусско-российская дружба. Белорусский президент в резкой форме выразил свое недовольство российскими союзниками, заявившими о грядущей денонсации Бишкекского соглашения о безвизовом режиме. Наверняка, президент Лукашенко боится, что ему тоже могут не дать российскую визу. Как в 1997 году, когда наш президент захватил в заложники Павла Шеремета и съемочную группу ОРТ.

Теперь главе белорусского государства надо придумать аналогичный скандал, чтобы вернуть его Беларусь в фокус российских масс-медиа. Безуспешных поисков оператора ОРТ маловато будет. А посему белорусскому государю не стоит понапрасну жаловаться дорогому гостю Зюганову, что его, Лукашенко, российские телеканалы обделяют своим вниманием.

Весьма мало Россия интересуется судьбой белорусов и их экономики. Пусть курс белорусского расчетного билета по отношению к вечнозеленому доллару перевалил за рекордно-символическую отметку в 1 000 000 старыми. Разве это новость в сравнении с затоплением «Курска», пожаром на Останкинской телебашне или японским визитом президента Путина?

Но если финансовая система белорусского союзника в одночасье рухнет, российский премьер Касьянов пообещал подкинуть полновесных кремлевских рубликов. Обещанная российская помощь была очень приятно названа введением *«единой союзной валюты»*.

Тогда уж точно всем белорусам зарплату будут выдавать в российских рублях без задержек и промедлений. Поскольку ее пересчитают по курсу 35 BYB за 1 RUR. Интеграция называется. ■



Наш вернисаж. Художник П. Сдвижков-Пикассо «Старый еврей с мальчиком»

15 ОКТЯБРЯ

ВЫДВИЖЕНЦЫ

Александр Сдвижков

405 выдвиженцев в ПП № 2 президентского Нацсобрания отправили на регистрацию свои бумаги. С 5 по 15 сентября белорусское государство номинирует ему нужных и ненужных кандидатов в депутаты.

Вялотекущая избирательная кампания по выборам в члены Палаты представителей продолжается. Ни потенциальные кандидаты в депутаты, ни, тем более, избиратели не проявили должного рвения на этапе выдвижения, когда нужно было собирать подписи или устраивать номинации в заводских и фабричных конторах.

Активным абсентеизмом отличился электорат столичных избирательных округов. В Минске сборщиков подписей встречали очень неласково. Очень часто их гоняли от дверей грубой силой и еще более грубым словом.

Несколько легче шел сбор номинационных подписей в провинции. Жители глубинки сборщиков подписей все еще воспринимают как начальство. Они его традиционно опасаются прогневать — как бы чего не вышло.

Но не за страх, а за вполне осязаемое вознаграждение работало большинство сборщиков подписей, как в столице, так и в провинции. В среднем цена избирательской подписи колебалась от 15 до 60 американских центов. Причем первые 100 подписей, как правило, оплачивались по минимуму, зато цена последующих избирательских факсимиле достигала полудоллара и выше.

Особо состоятельные выдвиженцы подряжали сборщиков топтаться по округам вплоть до 5 сентября включительно. Невзирая на то, что необходимая тысяча избирательских подписей уже давно наличествовала в предвыборных закромах.

По правде сказать, были среди сборщиков подписей и нестяжатели. Немало топтунов из КП (б) и прочих аббревиатур коммунистической ориентации шастало по подъездам многоквартирных домов совершенно бескорыстно, исключительно из любви к марксизму или к своему выдвиженцу.

Скорбный труд сборщиков подписей даром не пропал. Они пробудили от спячки вертикальную номенклатуру. Где с подачи областной власти, а где еще раньше по собственной инициативе провинциальное начальство стало отделять своих агнцев от чужих козлищ.

Естественно, в число козлов, забредших в вертикальный огород, были незамедлительно определены все оппозиционеры, вознамерившиеся заседать в Нацсобрании. Держать и не пущать велено не только коммунистов-нонконформистов, социал- и либерал-демократов. В неугодные претенденты зачислен даже депутат Петр Жушма, снискавший себе лавры возмутителя палатного спокойствия.

Судя по бюрократической активности главного президентского администратора Михаила Мясниковича, центральная власть тоже не спит в шапку. Руководящие указания по отсеву неугодных выдвиженцев достаточно недвусмысленны. Лучше пусть будут в депутатах заслуженные доярки и кухарки, чем записные оппозиционеры.

В ответ радикальные кандидаты в системную парламентскую оппозицию его президентского величества начали стращать власть имущих европейским непризнанием нового состава Нацсобрания. Но власти ничуть не испугались шведского короля или немецкого канцлера. Тем паче, когда умеренные соискатели палатных мандатов ограничились робкими призывами к европейской общественности приехать и помочь им на выборах.

Окончание на с. 2

15 КАСТРЫЧНІКА

ТЭХНІЧНЫЯ ПЫТАННІ

Тацьцяна Папова

На 3-ай тэхнічнай канфэрэнцыі эўраструктур, што прайшла ў Вэне на мінулым тыдні, абмяркоўвалі рэкамэндацыі адносна дасланьня назіральнікаў на восеньскія выбары. Сярод дзесяцёх міжнародных інстытуцый, што ўзялі ўёй удзел, упершыню зьявіліся сакратарыят СНД і Парлямэнцкая асамблея СНД. Гэта прымусіла дэлегатаў ад Каардынацыйнай рады дэмакратычных сіл Беларусі настырчыць вушы.

Сваю размову з журналістамі ў Менску Анатоль Лябедзька й Вінцук Вячорка распачалі з прыемнай для сябе навіны: міжнародных назіральнікаў на выбарах ня будзе. *«Для нас важнай задачай было, каб на Беларусі не было міжнароднага назіраньня, каб сюды не прыехала паўнавартасная місія, як у 95-ым годзе, калі ад аднаго АБСЭ было больш як 200 чалавек,»*— усхвалявана паведаміў лідэр АГП. Трэба адзначыць, што радасьць апазыцыянэраў небеспадстаўная.

Распрацаваныя рэкамэндацыі ўвабралі ў сябе 11 пунктаў. Прычым апошні пазначаў нязгоду прадстаўнікоў СНД з тым, што прыезд тэхнічнае місіі БДІПЧ да Ханса-Георга Віка не стане фактам міжнароднага прызнаньня дэмакратычнага характару й вынікаў выбарчага працэсу ў Беларусі. Наагул жа, з-за скрайняе палярнасьці меркаваньняў, дакумэнт атрымаўся вельмі супярэчлівы.

Рэкамэндацыі адзначаюць, хаця й нездавальняючы, але прагрэс у выкананьні чатырох умоў прызнаньня дэмакратычнасьці беларускага становішча. Але дэлегацыя Тэры Дэвіса дакладна ведае, што прагрэсу няма аніякага. Таму яна цьвёрда выступіла за ўлучэньне фразы аб адсутнасьці якіх-кольвечы эўрапейскіх місый у Беларусі ў дзень выбараў. Акцыяй пратэсту стаў дэмарш беларускага намесьніка міністра замежных спраў Мартынава. Каб зьняць напружанасьць, Вік выкрэсьліў гэтыя словы. Вольфганг Бэрэндт ад Рады Эўропы й Ян Марынус Версма ад Эўрапарлямэнту накіраваліся да дзьвярэй, пакінуўшы астатнім самім прымаць і выконваць свае рэкамэндацыі.

У заяве амэрыканскага амбасадара ў Сталай Радзе АБСЭ Дэвіда Джонсана падкрэсьліваецца недастатковасьць дэмакратычнага прагрэсу ў Беларусі. Гэта ставіць пад сумнеў мэтазгоднасьць назіраньняў. ЗША згодныя працягваць пошук шляхоў для станаўленьня дэмакратыі й правоў чалавека ў Беларусі. Але намаганьні па дасягненьні кампрамісу мусяць прыкладаць беларускія ўлады, а не АБСЭ.

СНДэшныя гнулі сваю палітыку як умелі. Напярэдадні канфэрэнцыі быў разасланы ліст Іванова ў адпаведныя міністэрствы краін-удзельніц АБСЭ. Анатолю Лябедзьку стала вядома пра званкі Селязьнёва ў міжнародныя арганізацыі, што ўдзельнічалі ў тэхнічнай канфэрэнцыі. СНД і парлямэнцкая асамблея СНД намагаліся заблякаваць прыняцьце 3 зь 10 рэкамэндацый. Не атрымалася. Цяпер яны плюнуць на толькі што падпісаную паперу й дашлюць сваіх назіральнікаў .

Заканчэнне на с. 2



АНЕКДОТ-С

По мнению правительственной комиссии, пожар на Останкинской башне возник из-за ее столкновения с другой телебашней, предположительно английского или американского происхождения.

* * *

Поляк приехал в Минск, споткнулся на неровно уложенной тротуарной плитке и сломал ногу. В больнице он начал возмущаться:

— Вы бы хоть таблички «Осторожно» повесили или красный флажок...


— А вы, пересекая границу, красный государственный флаг видели? Так вот, это мы вас предупреждали.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



1 месца.
«Сістэма адукацыі цэментуе грамадства і насельніцтва».

(В. Стражаў, міністр адукацыі, прэс-канферэнцыя, 29.08.00)



2 место.
«Все, что надо у нас все прекрасно».

(В. Костенко, командующий войсками ПВО, пресс-конференция, 31.08.00.)



3 место.
«США не хотят воссоединения России и Беларуси».

(М. Сергеев, политолог, «Резонанс», 03.09.00)

НАВІНЫ

Праваабарончы цэнтр «Вясна» атрымаў папярэджанне ад Мінюсту 1 верасня. Мінюст лічыць, што бланкі і пячатка маюць недахопы. «Цэнтар» напісана з вялікай літары, а трэба пісаць з малой. На бланку ў адным месцы двукоссе не пастаўлена. А. Бяляцкі лічыць, што Міністэрству юстыцыі няма чым займацца, як шукаць, дзе якія кропкі і коскі стаяць на бланках розных арганізацый.

Міністэрства юстыцыі вынесла Аб'яднанай грамадзянскай партыі чацвёртае афіцыйнае папярэджанне. Зноў жа за бланк. Нібыта Мінская гарадская структура АГП карыстаецца бланкамі ўсей партыі, але не ўласнымі: *«На азначаных бланках пад назвай партыі неправамерна змешчаны тэрмін «Рэспубліка Беларусь». Гэтым парушаны патрабаванні дзяржаўнага стандарту СТБ 6-35-95 і ўказу прэзідэнта ад 07.04.2000 году нумар 172. Карыстаючыся артыкуламі 33, 34 закону «Аб палітычных партыях», Міністэрства юстыцыі выносіць Нацыянальнай радзе АГП пісьмовае папярэджанне».*

Нацыянальная зборная Беларусі па футболу з лікам 2:1 выйграла ў каманды Уэльсу ў першым матчы адборнага турніру да чэмпіянату свету, што пройдзе ў 2002 годзе ў Японіі ды Карэі. Гэта быў першы афіцыйны матч беларускай зборнай з новым трэнерам — легендарным Эдуардам Малафеевым, якога многія ўспрымаюць сёння як месію беларускага футболу. Пад кіраўніцтвам Малафеева наша каманда ўжо згуляла адзін таварыскі матч — выйграла 16 жніўня ў Рызе ў зборнай Латвіі — 1:0.

Вярхоўны суд прызнаў неправамоцнымі ўсе прэтэнзіі Міністэрства юстыцыі да Беларускага аб'яднання маладых палітыкаў і абавязаў чыноўнікаў неадкладна зарэгістраваць гэтую грамадскую арганізацыю.

Сям'я экс-міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі абмяркоўвае магчымасць папрасіць палітычнага прытулку ў Нямеччыне. Вольга Захаранка з дачкамі Аленай, Юляй і маленькай унучкаю цяпер знаходзяцца ў Нямеччыне, куды яны з'ехалі месяц таму па запрашэнні адной з дабрачынных арганізацый.

Беларускія дакументалісты скончылі працу над публіцыстычным відэафільмам «Выбар». Стужка знята ў Польшчы. Асноўная ідэя фільму — выбар еўрапейскага ладу жыцця, які зрабіла польская супольнасць. Сцэнарная ідэя фільму «Выбар» належыць Юрыю Валошыну, Уладзімер Андронаў з'яўляецца апэратарам стужкі, а Леанід Міндлін — рэжысёрам і аўтарам тэкста і сцэнарыя. Спадар Міндлін распавёў, што фільмам ужо зацікавіліся на расійскай тэлевізіі. Як мяркуюць аўтары стужкі, гэты фільм будзе цікавым таксама для ўкраінскіх і для балтыйскіх тэлевізіяў.

У верасні падвышаюцца мінімальныя памеры пенсій па ўзросце. Гэта звязана з ростам сярэдняй заработнай платы. Такім чынам, мінімум вераснёўскай пенсіі будзе складаць 16881 рубель. Сярэдні памер пенсіі па ўзросце складзе 30 тысяч рублёў. Нагадаем, што з 1 верасня таксама падвышаны памер мінімальнай заработнай платы і тарыфнай стаўкі першага разраду.

Віцебскія пенсіянеры ўпадабалі сабачую ежу. У якасці дэлікатэсу яны актыўна раскупляюць сабачыя кансервы «Палкан», зробленыя з конскага мяса. Бляшанка «Палкана» каштуе 252 рублі, што прыкладна ў два разы танней за кансервы, прызначаныя для спажывання людзмі.

Вынаходлівыя кіраўнікі гаспадарак знайшлі новы спосаб захаваць калгасны статак. Яны здаюць напракат сялянам калгасных кароў, даючы кармы і салому. Умоваю пракату з'яўляецца здача 2 тон малака й аднаго цяляці штогод. Падобны спосаб захавання статку ўзяты на ўзбраенне ў Буда-Кашалёўскім раёне.

65 % беларусаў бачаць сваю дзяржаву незалежнай. Такія дадзеныя апытання, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў. У апытанні ўдзельнічалі паўтары тысячы рэспандэнтаў, якія прадстаўляюць усе сацыяльна-дэмаграфічныя групы грамадства. Толькі 19 % апытаных не змаглі адказаць на прапанаванае пытанне. 16% рэспандэнтаў не выказваюць жадання, каб нашая Беларусь была незалежнай, а жадалі б, каб яна ўвайшла ў склад Расіі.



Пытанне аб кіраўніцтве Саюзам прадпрымальнікаў вырашыцца 6 верасня. Менавіта на гэты дзень прызначана паседжанне Рады гэтага грамадскага аб'яднання. Напярэдадні некаторыя сябры прэзыдыума БСП — віцэ-прэзідэнты і прадпрымальнікі Аляксандар Патупа і Міхаіл Шавельзон — выступілі катэгарычна супраць удзелу Карагіна ў парламенцкіх выбарах пад сцягам Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Цяпер канчатковае вырашэнне пытання залежыць ад пазіцыі 25 сяброў Рады БСП. Сам Карагін гатовы выканаць волю большасці і пайсці ў адстаўку, калі такое рашэнне будзе прынята.

ПОСЛЕ СЪЕЗДА

ЛИБЕРАЛЫ ОПРЕДЕЛИЛИСЬ ОКОНЧАТЕЛЬНО

Вадим Казначеев

Пятый съезд Объединенной гражданской партии собрался на свою вторую сессию с единственной целью: полностью и окончательно решить вопрос об участии в выборах в Нацсобрание.

Полторы сотни либералов со всей страны и гости съехались в обшарпанное здание клуба МАПИД на столичной окраине 3 сентября. Если бы, чисто теоретически, ОГП решила участвовать в выборах, то партийным функционерам пришлось бы проводить бессонную ночь, в течение которой спешно готовить документы в избиркомы: съезд имел место аккурат накануне последнего дня регистрации кандидатов.

Подобное было возможным лишь абстрактно — практически никто не сомневался, что на предмет избирательного фарса будет принято негативное решение: подавляющее большинство как руководства ОГП, так и рядовых членов партии (и в столице, и в регионах) уже давно были настроены против участия в этих выборах. Именно в русле неприятия выборов по правилам, навязанным режимом, ОГП проводила свою политику в последнее время.

Проблема обретения власти, стоящая перед оппозицией в любом государстве, на этих выборах не может быть решена априори. *«Если бы «палата» даже целиком, на 100 процентов, состояла из членов ОГП — в Беларуси ничего бы от этого не изменилось, просто было бы немного больше шуму. «Палата» не обладает реальной властью,* — подчеркнул заместитель председателя ОГП Павел Данейко. — *После того, как в 1996 году был установлен авторитарный режим, вопрос о свободных выборах был закрыт».* Бойкот выборов в Палату представителей П. Данейко назвал одним из элементов *«реального плана проведения президентских выборов по нормальной схеме».*

Другой зампред ОГП, Ярослав Романчук (также, как и Данейко, экономист), анализируя обещания *«батьки»* насчет расширения полномочий парламента, отметил: *«Лукашенко хочет сделать из «палатки» своеобразный громоотвод перед президентскими выборами».*

Что ж, вполне возможно — подобные планы (которые на самом деле топорны и примитивны, но в условиях информационного блокирования оппонентов нередко в той или иной степени проходят) полностью вписываются в общую линию, которую *«батька»* гнул с самого начала своего правления.

Однако при всем бесправии *«палаты»* режим широко задействует административный ресурс, дабы провести в свой псевдопарламент своих же выдвиженцев. Делегаты из различных регионов Беларуси рассказали о *«тотальном обмане и вопиющих нарушениях избирательного кодекса»*; о том, какое давление оказывается на трудовые коллективы, чтобы те выдвинули кандидатами спущенных сверху людей; о препонах, которые чинятся неугодным претендентам — причем даже по отношению к лояльным .

Так, в Лепельском районе местный предрайсполкома робко сообщил группе, приехавшей представлять кандидата Романа Ананьева, что сам подумывает выдвинуться. В ответ услыхал чуть ли не брань: «Да как ты смеешь?! Что ты себе позволяешь?! Этого человека прислал президент — ты против президента?!!!»

Незначительная (в количественном отношении) часть партии считает, что в выборах следовало участвовать и в таких условиях — лучших, дескать, никто не предложит; тех, кто выступает за бойкот, характеризовали как маргиналов, находящихся на обочине политики.

Окончание на с. 6

15 ОКТЯБРЯ

ВЫДВИЖЕНЦЫ

Окончание. Начало на с. 1

Однако и без Европы подготовка к белорусским выборам идет своим бюрократическим чередом. По возможности, из участковых избиркомов вычищаются партийцы из ЛДП и КП. Размещены заказы на печатание избирательных бюллетеней с запасом, в полтора раза больше, чем нужно.

Предусмотрена и система мероприятий на случай, если явка избирателей не достигнет 50 процентов. Недостающий электорат добавят, как это было на референдуме 1996 года. На что, спрашивается, в белорусском избирательном кодексе предусмотрено условно-досрочное голосование за неделю до выборов?

Если президентская вертикаль не подведет, то 75 провинциальных округов дадут пассивно-послушное большинство нацсобранцев. Зато в столице должен быть разгул демократии и многопартийности. Но явку избирателей никто обеспечивать не собирается. Придут ли на выборы не слишком лояльные к власти менчуки или нет, столичных администраторов не интересует. Потом же можно будет обвинить во всем радикалов, бойкотирующих выборы.

Без опоры на административный ресурс сторонний кандидат в депутаты может обеспечить себе депутатское кресло лишь серьезными деньгами. Так, в 1995 гарантия избрания составляла в Минске не меньше 30 центов, потраченных на каждого из 20 тысяч избирателей в округе. Ныне же избирательные округа стали в три раза крупнее. Стало быть, придется раскошелиться, по минимуму, эдак на 18 тысяч долларов, чтобы гарантировать депутатство кандидату, независимому от властей предержащих. Денежных людей или выдвиженцев, имеющих столь щедрых спонсоров, среди партийцев и независимых не слишком много.

Власти останутся довольны, если количество системных оппозиционеров в Нацсобрании не превысит магического пиаровского числа «7 ± 2». Этого вполне достаточно для вящего торжества демократии a la Lukachenko. Но маловато для панъевропейского признания выборов 15 октября 2000 года. ■

ТЭХНІЧНЫЯ ПЫТАННІ

Заканчэнне. Пачатак на с. 1

Ад верагоднай прысутнасьці Адрыяна Севярына чакаюць толькі тэхнічнае экспэртызы ўмоў правядзеньня выбараў. Непасрэдна да назіральніцкае дзейнасьці ён ня будзе мець ніякага дачыненьня. Радасьць улад з нагоды прыезду эўрапейцаў выклікана або неразуменьнем сытуацыі, або жаданьнем давесьці да грамадзкасьці ілжывыя зьвесткі. Дакумэнт прадугледжвае зьмену пазыцыі міжнароднай грамадзкасьці ў выпадку пагаршэньня ці паляпшэньня сытуацыі ў Беларусі. Але трэба мець вельмі багатую фантазыю, каб уявіць, што за месяц да выбараў беларускія ўлады распачнуць дэмакратычныя пераўтварэньні.

Нашых апазыцыянэраў закідалі пытаньнямі, якія зусім ня тычыліся чатырох дэмакратычных умоў. Міжнародную грамадзкасьць цікавіла, ці ёсьць у беларускай апазыцыі раскол. Замежнікаў дзівіла, як можна адначасова вылучацца кандыдатам у дэпутаты й патрабаваць ад Эўропы непрызнаньня новага парлямэнта. Яны не разумеюць, як можна вылучаць сваю кандыдатуру ў парлямэнт і адначасова прасіць міжнародную супольнасьць не прызнаваць выбараў.

Сістэмных апазыцыянэраў: Абрамавай, Навасяда і Фядуты — ў Вэне не было. Іх лісты ў эўраструктуры не прыцягнулі ўвагі замежнікаў нават маляўнічай рэклямай сябе любімых, прыкладзенай да асноўных допісаў. Лідэры БНФ і АГП былі абураныя жэстам Абрамавай, што *«выратавала Беларусь ад штурма складам Вярхоўнага Савета па ініцыятыве Ганчара і Лябедзькі будынку парлямэнта», «ініцыятара імпічменту Аляксандру Лукашэнку»* й *«выбітнага апазыцыйнага журналіста».* ■

АБАРОНА

БАЯВОЕ СЯРОЎСТВА

Тацьцяна Папова

Сумесныя вайсковыя вучэньні «Баявая садружнасьць–2000» праходзілі ў гэтым годзе ў надзвычай складаных умовах. Аб гэтым заявіў камандуючы войскамі Супрацьпаветранае абароны (СПА) РБ Валеры Кастэнка. Ён асабіста курыраваў дзейнасьць нашых лётчыкаў ды зэнітчыкаў на расійскіх палігонах у жніўні гэтага года.

На сумесных вучэньнях прысутнічалі 7 краін СНД, а агульная колькасьць удзельнікаў перавысіла 1600 чалавек. У гэтым годзе, акрамя традыцыйнага палігона пад Ашулукам, вучэньні праходзілі й у Калінінградзкай вобласьці. Дысьлякацыя нашых вайскоўцаў на тамтэйшую базу была адносна недарагой з-за тэрытарыяльнае блізкасьці. Новы раён, аднак, падаўся салдатам і кіраўніцтву складанейшым, чым Ашулукскі. Па словах Кастэнкі, нашым ракетна-зэнітным брыгадам замінаў Балтыйскі флот.

Першымі стралялі расійцы. Яны пасьпяхова выканалі задачу й прадставілі поле для дзейнасьці беларускім зэнітчыкам. Беларускія мішэні спачатку проста не стартавалі, а пасьля правядзеньня новых разьлікаў адна зь іх узьнялася ў неба й зьнікла ў моры. Праявіць сваё майстэрства зэнітчыкі здолелі, толькі калі мішэнь запусьцілі з карабля. Камандуючы Балтыйскага флота Ягораў не пасьпеў пахлопаць Кастэнку па плячы й сказаць некалькі суцяшальных слоў, як адмірала абступілі журналісты. Кастэнкам мясцовыя СМІ не цікавіліся.

Беларускім вайскоўцам была даручана адказная місыя падрыхтоўкі дывізыёнаў для таджыкскіх вайскоўцаў. Для паўднёвых сяброў нашыя наладчыкі працавалі вельмі сумленна. Таджыкі, што ніколі ня ўдзельнічалі ў такіх мерапрыемствах, сарвалі аплядысмэнты стоадсоткавай трапнасьцю сваіх стрэлаў. Шэраг мішэняў беларусы зьнішчылі разам з армянамі.

Некалькі дзён таму камітэт па СПА з прадстаўнікоў краін СНД падвёў вынікі «Баявое садружнасьці» й зацьвердзіў плян сумесных дзеяньняў на 2001 год. Наступная вялікая сумесная трэніроўка войскаў СПА адбудзецца 7 верасьня. Нашымі партнэрамі стануць украінскія й расійскія лётчыкі.

Да канца гэтага года камандуючыя войскамі СПА Беларусі й Расіі мусяць пакласьці на стол сваім міністрам абароны праекты аб складзе, дзейнасьці, мэтах, прызначэньні й іншых нюансах аб'яднанае групоўкі войскаў.

Беларускія вайскоўцы пачувалі сябе на баявых вучэньнях ня дужа ўтульна. Форма на іх была палявая. Адзінымі знакамі, па якіх можна было вызначыць беларусаў, былі адмысловыя эмблемы. Яшчэ не зацьверджаныя начальствам, яны апынуліся на грудзях жаўнераў і сталі аб'ектам кпінаў для замежных калег. Чаму бязь сьмеху на іх нельга было глядзець, Кастэнка не ўдакладніў, але заўвагі калег старанна запісаў. ■

ДАЛЬНЯЕ ЗАМЕЖЖА

НАД БЕЛЬВЭДЕРАМ ДОБРАЕ НАДВОР'Е, НАД ДРАЗДАМІ ЗНОЎ ІДУЦЬ ДАЖДЖЫ

Алесь Семчанка

Азіраючыся на дваццацігадовую гісторыю прафсаюзу «Салідарнасьць», міжволі параўноўваеш тыя падзеі ў Польшчы з нашай сучаснай беларускай рэчаіснасьцю.

У 70–80-ыя ПНР была такой жа арэнай барацьбы паміж Захадам і Усходам, як зараз Беларусь. Як і «Салідарнасьць», нашая апазыцыя мусіць апэляваць да міжнароднай супольнасьці, прасіць ґрашовай і палітычнай падтрымкі. «Салідарнасьць» таксама змагалася ва ўмовах жорсткай цэнзуры й манаполіі дзяржавы на mass media. Бадай, на гэтым амаль усё падабенства й вычэрпваецца, пачынаюцца адрозьненьні.

Наяўнасьць легальнае вольнае прэсы для палякаў дваццацігадовае даўнасьці зьяўлялася толькі марай. Тады Польшча перажывала моцны ўсплёск самвыдату. Гэта быў час, *калі прыстойныя людзі* віталіся адзін з адным на вуліцы так: *«Добры дзень, пан рэдактар! — І Вам добры дзень, пан рэдактар»*. Наклады прафсаюзнай газэты *Robotnik* дасягалі 70000 асобнікаў. Тысячы іншых выданьняў выходзілі больш сьціплымі накладамі, але яны ахоплівалі амаль усіх жыхароў краіны.

Гэта вельмі падобна на сучасную Беларусь. Ёсьць у нас і свой «Рабочы» — ворган Свабоднага прафсаюзу, ёсьць і тысячы дробнае самвыдатаўскае прэсы. *Толькі невялічкая розьніца: палякі* выдавалі свае газэты на абсталяваньні, якое амаль не адрозьнівалася ад друкарняў Гутэнбэрга й Скарыны. Калі не хапала фарбы, то яе рабілі з мыйных сродкаў, крэмаў і пастаў. А зараз існуюць кампутары, прынтэры, ксэраксы й рызографы, якія ў сто разоў хутчэй і лягчэй робяць тую ж працу.

Другім адрозьненьнем ёсьць хаўрус польскае інтэлігенцыі з рабочымі. Гэта была сапраўдная салідарнасьць: зманыя ў краіне інтэлектуалы з KOR'у (Камітэт абароны рабочых) падтрымлівалі сем'і зьняволеных лідараў «Салідарнасьці», забясьпечвалі кантакты з заходнімі *дэмакратыямі й ідэалягічнае абслу*гоўваньне прафсаюзнага руху. А рабочыя пад час страйкаў высоўвалі патрабаваньні аб вызваленьні зь вязьніц актывістаў KOR'а, змагаліся ня толькі за кілбасу.

У нас, здаецца, апазыцыйныя *палітыкі* жывуць у *паралельнай* з уласным народам прасторы. Ці то народ не дарос, ці то апазыцыя такая.

Значны ўнёсак у справу барацьбы з камунізмам зрабіла абраньне Папай Рымскім паляка Караля Вайтылы й ягоныя візыты на радзіму ў 1979 і 1983 годзе. Першы прыезд падняў энтузыязм палякаў і прывёў да нараджэньня 10-ці *мільённай «Салідарнасьці»*. Другі дапамог перажыць рэпрэсыі ўладаў пасьля ўвядзеньня ваеннага становішча й разгрому рабочага супраціву. Аўтарытэт Яна Паўла II сярод палякаў немагчыма параўнаць ні з чым у сучаснай Беларусі.

Ці ёсьць у нас увогуле маральныя аўтарытэты? Васіль Быкаў? Наўрад ці ягоны ўплыў сягае далей за невялікую купку інтэлігентаў. Дарэчы, ці ёсьць у нас увогуле нейкія маральныя каштоўнасьці, максымы, якія лучаць усю нацыю? Здаецца, нягледзячы на тысячагадовую гісторыю хрысьціянства на Беларусі, мэнталітэт народа застаўся паганскім. Прынамсі, пра *прыналежнасьць* да хрысьціянства мы ўзгадваем толькі напярэдадні Калядаў і Вялікадня.

Палякам было цяжэй. Гэта не памылка: нам, сапраўды, лягчэй. За нашым рэжымам няма ценю танкаў Варшаўскага пакта. У нас, дзякуй Богу, пакуль не падаўляюць БТРамі страйкі, не расстрэльваюць адкрыта страйкаўцаў. Колькасьць палітычных вязьняў не дасягае некалькіх тысячаў, як у Польшчы 1981 года.



Седзячы ў лягеры для інтэрнаваных дзеячоў «Салідарнасьці» пасьля ўвядзеньня ваеннага становішча, Лех Валэнса й уявіць ня мог, што праз нейкіх дзесяць гадоў стане першым дэмакратычна абраным прэзыдэнтам некамуністычнае Польшчы. І ніхто з палякаў уявіць ня мог. Але яны змагаліся й не гублялі надзею. Гэта ёсьць самым галоўным урокам «Салідарнасьці». Пра гэта пісалі ў сваёй песьні Адам Асьнык і Тадэвуш Прэйснэр:

«Майце адвагу, ня тую аднадзённую, // Што пад час роспачнае справы прыскае, // Але тую, што вечна з паднесенаю галавой // Не дае сьпіхнуць са свайго месца». ■

БЛІЖНЯЕ ЗАМЕЖЖА

У БІШКЕКУ ЎСЁ СПАКОЙНА

Таццяна Папова

Дзень незалежнасьці Кыргызскае Рэспублікі адзначыўся народнымі гуляньнямі на вуліцах і плошчах гарадоў краіны. Напярэдадні абраньня новага прэзыдэнта людзей кармілі ня толькі гарачым пловам, але й перадвыбарчымі абяцанкамі. Палітычныя мітынгі й дэманстрацыі ў дзень нацыянальных урачыстасьцяў не забараняліся.



У Кыргызскай Рэспубліцы 29 кастрычніка пройдуць прэзыдэнцкія выбары. Васемнаццатым кандыдатам на кіраўнічую пасаду стаў нязьменны з 1990 года лідэр краіны Аскар Акаеў. Нагадаем, што пяцёхгадовы тэрмін яго прэзыдэнцтва распачаўся пасьля абвяшчэньня незалежнасьці рэспублікі ў 1991 годзе. Папулярнасьць у 65 адсоткаў жыхароў забясьпечыла яго пераабраньне на другі тэрмін. Большага тамтэйшая канстытуцыя не дазваляла. Таму Аскар Акаеў вырашыў зьмяніць асноўны закон і арганізаваў шэраг усенародных рэфэрэндумаў. Усьцешаны ўласнай значнасьцю кыргызскі народ, на думку лідэра Народнае партыі Даніяра Усенава, добраахвотна «*тройчы кастрыраваў парлямэнт*». Канстытуцыйны ж суд заявіў, што ў адпаведнасьці з новым законам Аскар Акаеў заканчвае толькі першую сваю легіслатуру, а таму мае права зноў балатавацца ў прэзыдэнты.

Сам кіраўнік Кыргызыі ведае, што судовая сыстэма ў краіне выклікае шмат нараканьняў. Асабліва гэта тычыцца справы лідэра партыі «Ар-Намыс» Фэлікса Кулава, арыштаванага па крымінальным абвінавачаньні й пазбаўленнага высокае службовае пасады. Нягледзячы на выключна крымінальны, па словах Акаева, характар яго справы, зьняволеньне Кулава атрымала палітычную афарбоўку. Кыргызская апазыцыя накіравала ўсю сваю агрэсыўнасьць на правядзеньне мірных пікетаў у падтрымку Кулава. Лейт-матывам усіх лёзунгаў «Ар-Намыса» ёсьць меркаваньне, што *«ў Кыргызыі няма апазыцыі. Ёсьць кіраўніцтва, што знаходзіцца ў апазыцыі да свайго народа»*.

Апазыцыя ў Кыргызскай Рэспубліцы існуе й час ад часу, няхай ня вельмі гучна, але выказвае незадаволенасьць цяперашнімі ўладамі. Лідэр нацыяналістычнае партыі «Асаба» Чапрашты Базарбаеў упэўнены, што ўлада ў Кыргызыі адарваная ад народа, існуе сама па сабе й імкнецца набіць кішэні. Па яго меркаваньні, усе кыргызскія законы сьпісаныя з заходніх і не падыходзяць мясцовым насельнікам па мэнталітэце. Неабходнай ён лічыць распрацоўку праекта нацыянальнае *ідэалёгіі дзяржавы* і ўвядзеньне закона аб мове. Па выніках апошніх парлямэнцкіх выбараў, з гэтымі ідэямі згодныя толькі 1,6 адсотка кыргызцаў.

Партыя камуністаў Кыргызыі, якая набрала на лютаўскіх выбарах больш як 30 адсоткаў, сьцьвярджае, што няма сілы, якая здолела б зьвесьці рэспубліку са шляху дэмакратыі. Камуністы дагэтуль ня могуць дараваць уладам прыватную ўласнасьць на зямлю й продаж важных стартэгічных аб'ектаў па сымбалічных коштах.

«Кайран Эл» у асобе Дааранбека Садырбаева *«кыргызам ня верыць, кыргызскім СМІ — тым больш»*. Ён упэўнены, што менавіта мас-мэдыя вінаватыя ў сытуацыі. Яны пелі дыфірамбы ўладзе. Агулам у Кыргызыі зарэгістравана 415 друкаваных выданьняў, але рэальна працуе ня больш як траціна. Фінансавую самастойнасьць мае толькі пятая частка ад гэтае колькасьці. Астатнія выданьні належаць міністэрствам і камітэтам. У кастрычніку 1998 года пад час рэфэрэндума кыргызскі народ падтрымаў унесеныя ў канстытуцыю нормы, што забаранялі любыя заканадаўчыя ініцыятывы, накіраваныя на абмежаваньне свабоды слова і друку. Між тым, па словах прадстаўніка бішкекскага офіса АБСЭ Ежы Вэнцлава, у Кыргызыі рэальна існуе структурная цэнзура.

Пасьля парлямэнцкіх выбараў Акаеў прызнаў факты прыцягненьня да прававое адказнасьці некаторых кандыдатаў у дэпутаты, зацягваньня разьбіральніцтваў па гэтых справах, што па часе супадалі з пачаткам перадвыбарнае кампаніі. Супрацьпаставіць бязладзьдзю аб'яднаную апазыцыю ў Кыргызстане немагчыма. *«Гэта тое самае, што прымусіць Расію цалавацца з Чачэніяй,»* — кажа Садырбаеў.

Сваю чорную справу тут робіць і Белы дом, намагаючыся пасварыць лідэраў кланаў. Улады даюць на месцы дырэктывы высьветліць, хто ёсьць аксакалам, аўтарытэтам роду. Гэтых людзей запрашаюць на размову, ускона ўплываючы такім чынам на ўзьнікненьне супярэчнасьцяў. Працэсы дэмакратызацыі ў рэспубліцы запаволіліся. *«На гэта ёсьць аб'ектыўныя прычыны. Нашы чыноўнікі — гэта былая партыйна-дзяржаўная наменклатура»*, — уздыхае Акаеў.

Даніяр Усенаў упэўнены, што *«унутрыпалітычная сытуацыя ў Кыргызыі можа прывесьці рэспубліку да падзеньня ў бездань грамадзянскае вайны»*. Па словах надзвычайнага й паўнамоцнага амбасадара Кыргызыі ў нашай краіне Рысбека Качкеева, нягледзячы на перадвыбарную ліхаманку, палітычнае становішча ў краіне спакойнае.

У Кіргізыі дзяржава існуе дзеля дзяржавы, апазыцыя — дзеля апазыцыі. Народ жа бадзяецца сам па сабе. Апазыцыя не карыстаецца магчымасьцю гуртаваць вакол сябе людзей, хаця дзяржава ня вельмі клапоціцца аб іх дабрабыце. Фінансавае становішча насельніцтва мяжуе з жабрацкім. Сярэдні заробак складае толькі 1050 сомаў. Гэта меней як 25 амэрыканскіх даляраў. Колісь прыбытковыя руднікі й вугальныя шахты зачыненыя. Эканамічныя рэформы забуксавалі ў той багне, дзе цяпер апынулася нацыянальная гаспадарка. Найбольш пэрспэктыўнай галіной для разьвіцьця стала вытворчасьць электраэнэргіі. Па водных рэсурсах Кыргызыя займае трэцяе месца ў СНД. Суседнія краіны ня супраць заключыць буйныя кантракты. Але замежныя інвэстары не цікавяцца пэрспэктывамі будаўніцтва новых ГЭС. Самі ж кыргызцы не пацягнуць такіх выдаткаў.

Затое надзвычай пэрспэктыўным бізнэсам ёсьць наркагандаль. У савецкія часы рэспубліка афіцыйна зьяўлялася галоўным вытворцам опія-сырцу на патрэбы Мінздрава. Ужо тады на чорны рынак сыходзіла да чвэці ўраджая.

У жніўні Аскар Акаеў адмовіўся ад сочынскага сонца з-за паведамленьня аб новых спробах пранікненьня ісламскіх баевікоў на кыргызскую тэрыторыю. Сакратар Рады бясьпекі Болат Джанузакаў заявіў, што на таджыкска-кыргызскай мяжы цяпер знаходзяцца каля 700 ісламістаў. Але таджыкскія ўлады сцьвярджаюць, што *«камісія, куды ўвайшлі ўплывовыя ў мінулым палявыя камандзіры, не знайшла ў гарах сьлядоў ісламістаў»*.

Сапраўды, Таджыкістан і Кыргызстан ёсьць толькі транзыт для ісламістаў Узьбекістана. Па зьвестках кыргызскае Рады бясьпекі, ісламістаў фінансуе саудаўскі мільянэр Усама бэн Ладэн, кіруе імі адзін зь лідэраў Ісламскага руху Узьбекістана Джума Намангані, а самі тэрарысты ўяўляюць вельмі стракаты кантынгент. Па сьведчаньнях афіцэраў ваеннае разьведкі, разам з узьбекамі, афганскімі талібамі, арабамі, пакістанцамі і чачэнцамі за іслам змагаюцца наёмнікі славянскіх краін і жанчыны-снайпэры. ■

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ



Казус, когда американцы прислали пострадавшим от землетрясения эфиопам клюшки для гольфа, никогда больше не повторится. Залогом этого стал визит Билла Клинтона в Нигерию, ставший символом нового курса США в отношении черного континента. Если раньше американцы наобум вбухивали деньги в африканские режимы, то теперь помощь будет более адресной. Счастливчиками окажутся те, кто на деле проводит в жизнь принципы демократии. Например, Нигерия, которая отказалась от диктатуры и ввела конституционное правление. Нигерийцам Клинтон пообещал львиную долю из 900 миллионов долларов, отведенных бюджетом США на помощь Африке. А диктаторы будут сосать лапу.

Будапештский муниципалитет объявил тотальную войну владельцам коммерческих ларьков. Комки, коих в столице Венгрии насчитывается аж 30 000 штук, выкорчевывают под корень. Владельцы ларьков негодуют: раздаются призывы обратиться к украинской мафии и *«заказать»* мэра. Однако правительство неумолимо. Ночники — столп мадьярского криминала, реализующего через них контрабандные алкоголь и табак.

Один из самых известных экс-террористов Хорст Малер вступил в неонацистскую Национально-демократическую партию. Это стало шоком для левых, поскольку начинал Малер как примерный борец с гнидой капитализма. В 1968 году, будучи адвокатом, он защищал основателей РАФ (Фракция Красной армии). По ходу процесса Малер так проникся теориями своих подзащитных, что сам подался в террористы. Бывший адвокат организовал ряд покушений, пока в 1970 году не был арестован. Левые организовали кампанию за освобождение узника совести. Среди его поручителей был даже Герхард Шредер, нынешний канцлер, а тогда — вожак эсдэковского комсомола. Но неблагодарный Малер вышел на свободу и ударился в другую крайность.



Экономисты бьют тревогу: мир катится к новому нефтяному кризису, аналогичному шоку 70-х годов. За последние 18 месяцев цены на нефть выросли втрое, а 24 августа взяли рекордную высоту — 30 долларов за баррель. Потенциальные жертвы нового скачка цен на топливо — европейские страны, и без того страдающие от инфляции евро. Рост цен может ослабить потребительский бум и вызвать промышленную стагнацию. Уже пострадала Франция, где подняты цены на бензин.

Еще один нож в спину французского централизма. 1 сентября во французском Бресте открылась телестудия, ведущая регулярные трансляции на бретонском языке. Эксперимент с *роднай мовай* на телевидении начался в 1998 году, когда местная интеллигенция попыталась комментировать матчи Кубка мира. Оказалось, что у бретонского ТВ солидная аудитория — 6 миллионов человек. Сразу нашлись спонсоры, среди которых итальянский телемагнат Сильвио Берлускони. В день открытия нового канала в Бресте состоялась манифестация бретонских регионалистов.



Срывай день — лозунг ольстерских юнионистов из организации «Ольстерские волонтеры». Едва закончились сезонные стычки с католиками- ирландцами на почве оранжистских маршей, волонтеры, чтобы не терять практику, решили истреблять лидеров другой юнионистской группировки. Между юнионистами вспыхнула кровавая вендетта, которой не могли нарадоваться ирландцы. Наконец в драку вмешались власти. Лидер волонтеров Джонни Эдар по кличке Бешенный пес, из-за которого начался сыр-бор, арестован и препровожден на нары.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ОБЫКНОВЕННАЯ НЕКРОМАНТИЯ

ЖИВЫЕ И МЕРТВЫЕ

Алексей Маковец

В яму у многоквартирного минского дома жертвы Холокоста спускаются к месту своего расстрела. Вот такой памятник работы маститого архитектора Леонида Левина появился в нашей столице этим летом. На открытии монументальной композиции мертвые стояли рядом с живыми, смешиваясь с участниками церемонии открытия. Грандиозное было зрелище по своему воздействию на постороннего зрителя, исповедующего принцип разделения миров — профанного и сакрального, дольнего и горнего, посюстороннего и потустороннего.




Фото А. Сдвижкова

НОСАФЕРАТУ

Неупокоившиеся мертвецы, языческие навьи, призраки во плоти явились на место своей злой кончины. Они стоят среди живых, а живым — хоть бы что; мертвые рядом — а их словно не замечают, привыкли. Обыденный столичный пейзаж: дом над расстрельной ямой, мини-футбол у обелиска, расстрелянные, в вечном спуске к месту казни. Белорусский день мертвых без перерыва. Что нам гетто, что нам Кураопаты.

Символично, что не столь далеко от памятной ямы располагается еще одно скорбное место общественного пользования — подземелье минской Ходынки, выход из станции метро «Немига», отмеченный уродливыми металлическими цветами и с куда большей теплотой выполненными неказистыми самодельными алтарями по погибшим, надгробиями без могил.

Выходящий из метро встречается глазами с мертвыми, поднимаясь или спускаясь по ступеням, где в давке погибли те, что ныне смотрят на нас с приклеенных к стенам перехода фотографий. Эти импровизированные капища, как и металлические цветы на гробовой плите над станцией метро, как и процессия жертв к памятнику самим себе на улице Мельникайте — симптом достаточно любопытного, характерного для нынешней Беларуси явления — особого, постсоветского восприятия смерти.

И на Немиге, и на Мельникайте, в отличие от церквей, что стоят на возвышениях, тянутся ввысь, к горнему, к вечной жизни и возрождению, — ямы, подземелья, низкие места. Мертвые в Яме не покидают место гибели, а идут к обелиску самим же себе, точно проклятое место их не отпускает, тянет вниз; на Немиге капище все там же, под землей, в переходе. Тоже символично. Словно погибшие так и застряли в земной юдоли, в земле, в переходе. Те, что на Немиге, — не ушли, те, что в Яме — никак не уйдут, возвращаются.

СМЕРТЬ ЧЕЛОВЕКА

Феномен человеческой смерти — не просто распада омертвевших тканей, а ухода уникальной, неповторимой личности из мира живых — в культурном пространстве постсоветской Беларуси, как и прежде советской, не осмыслен и не освоен. Христианское, вообще религиозное отношение к человеческой смерти, ее освоение культурой, вытравлено десятилетиями казенного атеизма. Что до насаждавшейся передовыми идеологами атеистически-материалистического мировоззрения, то в нем вопрос о человеческом в человеке вообще снят с повестки. С материалистической точки зрения кровь невинно убиенных такая же жидкость, как и всякая другая — что узники Освенцима, что скот на убой — один перегной.

Советская власть, искореняя веру огнем, мечем и букварем, насаждая атеизм-материализм, не могла компенсировать ею же порожденную ситуацию бессмысленности конечной жизни отдельной человеческой личности. Проблема смерти решалась двумя способами, параллельно. Первый — ликвидация самой человеческой личности, ее растворение в тоталитарной массе, оскотинивание человека, то есть подавление совести, самосознания; второй — формирование специфического, карикатурного и выхолощенного, коммунистического культа мертвых, причем культа посюстороннего.

НЕКРОНОМИКА КОММУНИЗМА

